# ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ СРОДКАМІ ЭТНАКУТКА «БЕЛАРУСКАЯ ХАТКА»

**І. А. Ганчарова**

*Настаўнік беларускай мовы і літаратуры,*
*ДУА «Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва»,*
*пр-т Віцебскі 33-11,212004, г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь,*
*irina_goncharova_1975@mail.ru*

У артыкуле разглядаецца важнасць выхавання патрыятызму ў сучасным грамадстве праз прызму этнаграфіі. Этнаграфічны падыход дазваляе глыбей зразумець культурную спадчыну беларускага народа, а таксама яго традыцыі, звычаі і фальклор. Асноўная ўвага надаецца метадам, якія садзейнічаюць развіццю нацыянальнай самасвядомасці, захаванню культурных каштоўнасцей і актыўнаму ўдзелу моладзі ў культурным жыцці краіны. Артыкул падкрэслівае неабходнасць інтэграцыі этнаграфічных даследаванняў у адукацыйны працэс як эфектыўнага сродку для фарміравання патрыятызму і любові да Радзімы.

***Ключавыя словы***: патрыятызм; выхаванне; этнаграфія; моладзь; пераемнасць.

# ВОСПИТАНИЕ ПАТРИОТИЗМА СРЕДСТВАМИ ЭТНОУГОЛКА «БЕЛОРУССКАЯ ХАТКА»

**И. А. Гончарова**

*Учитель белорусского языка и литературы,*
*ГУО «Средняя школа № 32 г. Могилева»,*
*Витебский проспект, 33-11, 212004, г. Могилев, Республика Беларусь,*
*irina_goncharova_1975@mail.ru*

В статье рассматривается важность воспитания патриотизма в современном обществе через призму этнографии. Этнографический подход позволяет глубже понять культурное наследие белорусского народа, его традиции, обычаи, фольклор. Основное внимание уделяется методам, способствующим развитию национального самосознания, сохранению культурных ценностей, активному участию молодежи в культурной жизни страны. В статье подчеркивается необходимость интеграции этнографических исследований в образовательный процесс как эффективного средства формирования патриотизма и любви к Родине.

***Ключевые слова***: патриотизм; воспитание; этнография; молодежь; преемственность.

# FOSTERING PATRIOTISM BY MEANS OF THE ETHNIC CORNER «BELORUSSKAYA KHATKA»

**I. A. Goncharova**

*Teacher of Belarusian Language and Literature,*
*State Educational Institution «Secondary School No. 32 of Mogilev»,*
*Vitebsky Prospekt, 33-11, 212004, Mogilev, Belarus,*
*irina_goncharova_1975@mail.ru*

The article examines the importance of fostering patriotism in modern society through the prism of ethnography. The ethnographic approach allows for a deeper understanding of the cultural heritage of the Belarusian people, their traditions, customs, and folklore. The main focus is on methods that promote the development of national self-awareness, the preservation of cultural values, and the active participation of young people in the cultural life of the country. The article emphasizes the need to integrate ethnographic research into the educational process as an effective means of fostering patriotism and love for the Motherland.

***Keywords***: patriotism; education; ethnography; youth; continuity.

Вельмі важнай задачай сучаснай школы з’яўляецца выхаванне ў дзяцей і навучэнцаў патрыятызму і грамадзянскасці, маральных якасцей. На гэта накіравана ўся школьная сістэма выхаваўчай работы, як класнай, так і пазакласнай. І гэта нармальная з’ява: кожная дзяржава ў першую чаргу павінна клапаціцца пра такі накірунак выхавання, таму што любой краіне патрэбны адданыя ёй людзі, якія не толькі любяць той край, дзе нарадзіліся і жывуць, але і стараюцца зрабіць жыццё ў ім лепшым, больш уладкаваным і шчаслівым, і не горшым, чым у суседзяў.

Патрыятызм – гэта любоў да Радзімы і свайго народа, адданае служэнне іх інтарэсам, шанаванне лепшых нацыянальных традыцый. Патрыятызм – адно з найбольш глыбокіх пачуццяў, замацаваных стагоддзямі існавання сваёй Айчыны. Тое ж самае датычыцца і грамадзянскасці: гэта прававая прыналежнасць асобы да пэўнай дзяржавы, выкананне яе законаў і звычаяў. Гэтыя задачы вырашаюцца на ўроках, пазакласных мерапрыемствах, але найбольш паспяхова яны могуць быць вырашаны шляхам прыцягнення вучняў да ўдзелу ў краязнаўчай рабоце. Назіраючы за жыццём сваёй краіны, знаёмячыся з яе гісторыяй, прыродай і культурнымі асаблівасцямі, выконваючы асобныя краязнаўчыя заданні, вучні вучацца па-сапраўднаму любіць сваю краіну, даражыць ёю. Чым больш яны будуць ведаць пра яе, тым хутчэй будуць станавіцца нацыянальна свядомымі грамадзянамі.

Краязнаўчая праца прывучае навучэнцаў да пошуку, прывівае ім цікавасць да гісторыі, павышае эрудыцыю. Праз знаёмства з этнаграфічнымі асаблівасцямі беларусаў, іх святамі, фальклорам і рамёствамі, мо-

ладзь атрымлівае магчымасць лепш зразумець свае карані. Гэта спрыяе развіццю патрыятызму, бо маладыя людзі пачынаюць ганарыцца сваёй культурай.

Этнаграфія дапамагае захаваць і перадаць наступным пакаленням нацыянальныя традыцыі. Праз даследаванні і практычныя заняткі, такія як майстар-класы па народных рамёствах, маладыя беларусы могуць задзейнічаць свае творчыя здольнасці і адчуць сувязь з гісторыяй сваёй краіны.

Этнаграфічныя даследаванні спрыяюць развіццю нацыянальнай самасвядомасці. Праз вывучэнне ўнікальных асаблівасцяў беларускага народа, яго гісторыі і культурных каштоўнасцяў маладыя людзі пачынаюць больш уважліва ставіцца да сваёй краіны і яе будучыні.

Арганізацыя этнаграфічных фестываляў, выставак і конкурсаў спрыяе актыўнаму ўдзелу моладзі ў культурным жыцці. Гэта не толькі развівае патрыятызм, але і спрыяе ўзаемадзеянню паміж пакаленнямі, што важна для развіцця грамадства.

Наш міні-музей «Беларуская хатка» абуджае ў навучэнцаў цікавасць да гістарычнай асветы, ён спрыяе фарміраванню высокай асабістай адказнасці за свой агульнаадукацыйны ўзровень, падахвочвае іх больш сур’ёзна ставіцца да вучобы і жыцця, спрыяе фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі, дапамагае выхоўваць пакаленне, здольнае прымнажаць дасягненні беларускага народа, з’уляецца добрым папулярызатарам беларускай мовы і культуры.

Менавіта праз дзейнасць этнакутка «Беларуская хатка» існуе магчымасць выхоўваць патрыёта і грамадзяніна не на абстрактных ідэалах, а на дакладных прыкладах, на далучэнні вучняў да гістарычнай і культурнай спадчыны нашай Радзімы. Толькі ведаючы свае карані, чалавек можа стварыць сваё светлае будучае.

Менавіта этнакуток «Беларуская хата» нясе ў сабе найважнейшую выхаваўча-адукацыйную функцыю. У міні-музеі дзеці судакранаюцца з прадметамі – праўдзівымі сведкамі культурнай спадчыны народа, яго багацця. Дзейнасць школьнага этнакутка, накіраваная на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, вельмі актуальная і адпавядае накірункам дзяржаўнай палітыкі ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі: «Вызначэнне зместу агульнай сярэдняй адукацыі на аснове прыярытэту нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, запытаў асобы, грамадства і дзяржавы».

Менавіта таму выхаванне патрыятызму, станаўленне нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскай годнасці школьнікаў праз вывучэнне і захаванне гістарычнай спадчыны стала асноўнай мэтай этнакутка «Беларуская хатка».

***Мэта:*** выхаванне любові і павагі да духоўных скарбаў свайго народа і развіццё зацікаўленасці гісторыяй роднага краю, мясцовымі тради-

цыямі і звычаямі, далучэнне слухачоў да культурна-гістарычнай спадчыны сваёй Радзімы.

***Задачы:***

- зацікавіць слухачоў гісторыяй роднага краю;
- выхаваць беражлівыя адносіны да свайго мінулага;
- выхаваць зацікаўленасць у набыцці гістарычных, краязнаўчых, этнаграфічных і моўных ведаў;
- садзейнічаць абуджэнню дапытлівасці і цікаўнасці вучняў;
- развіваць творчыя здольнасці вучняў.
- Для вучняў наладжаны музейныя заняткі.

Рэчы з этнагуртка з поспехам выкарыстоўваюцца для розных пазаўрочных мерапрыемстваў: гэта вечарыны і кірмашы, якія ўжо некалькі год запар восенню наладжваюцца ў сценах нашай школы, літаратурныя віктарыны, квэсты, інсцэніроўкі беларускіх казак, баек, песень («Касіў Ясь канюшыну»), інтэрактыўныя спаборніцтвы і гульні, фальклорныя святы, экскурсіі, сустрэчы з пісьменнікамі, беларускамоўныя акцыі, літаратурныя гасцёўні, тэатральныя сустрэчы, фальклорныя пастаноўкі, інтэлектуальныя турніры і конкурсы, выпуск літаратурна-моўнай рэкламнай прадукцыі.

З вялікім задавальненнем вучні вось ужо на працягу дзесяці год наладжваюць лялечныя спектаклі, так званую батлейку. Дзеці з задавальненнем робяць лялек, стараюцца як мага лепей выканаць сваю ролю, і хай батлейка ў нас не вельмі падобная да старажытнага варыянту (няма скрыні, артысты – гэта дзеці), але нават такі больш сучасны варыянт выклікаў масу эмоцый і нікога не пакінуў абыякавым. Вучні паказвалі гэты спектакль на тыдні беларускай мовы і літаратуры, навучэнцам пачатковай школы. І хай дзеці не зразумелі біблейскі сюжэт і, можа, не ўсе словы для іх былі блізкія, але, пагадзіцеся, наколькі важна, што навучэнцы на беларускй мове іграюць для дзяцей, што з іх вуснаў гучыць сакавітае, спеўнае беларускае слова, што кожнаму хочацца пабываць у ролі артыста. Гэтыя мерапрыемствы дазволілі вучням, педагогам, бацькам пашырыць звесткі пра мінулае і нацыянальную культуру беларусаў.

Этнаграфічныя музеі адыгрываюць важную ролю ў выхаванні патрыятызму, бо яны захоўваюць і прадстаўляюць матэрыяльныя і нематэрыяльныя культурныя каштоўнасці народа.

Этнаграфічныя музеі служаць месцам, дзе людзі могуць пазнаваць сваю культурную спадчыну. У музеях прадстаўлены экспанаты, якія ілюструюць традыцыі, звычаі, мастацтва і быт народа. Гэта дазваляе наведвальнікам глыбей зразумець сваю ідэнтычнасць і адчуць сувязь з гісторыяй.

Музеі прапануюць адукацыйныя праграмы, лекцыі і экскурсіі, якія дапамагаюць усвядоміць каштоўнасць культурнай спадчыны. Дзеці і моладзь вучацца шанаваць гісторыю сваёй краіны.

Этнаграфічныя музеі падкрэсліваюць асаблівасці нацыянальнай культуры, што спрыяе фарміраванню пачуцця гонару за сваю краіну. Экспанаты, якія адлюстроўваюць традыцыйнае мастацтва, рамёствы і звычаі, ствараюць унікальны вобраз нацыі.

У школьным музеі дзеці ўпершыню пачынаюць асэнсоўваць сваё дачыненне да ўсяго, што адбываецца навокал, а словы Радзіма, родны кут, любоў да Айчыны, подзвіг, патрыятызм напаўняюцца новым сэнсам. Дзверы музея заўсёды гасцінна адчыненыя як для навучэнцаў, так і для гасцей.

Этнаграфічныя музеі адыгрываюць ключавую ролю ў выхаванні патрыятызму. Яны не толькі захоўваюць культурную спадчыну, але і садзейнічаюць развіццю нацыянальнай свядомасці і патрыятычных каштоўнасцяў. У свеце, дзе глабалізацыя пастаянна ўзмацняецца, важна захоўваць і шанаваць унікальнасць кожнай нацыі, а этнаграфічныя музеі з'яўляюцца важным інструментам у гэтым працэсе.

Задача выхавання патрыятызму і грамадзянскасці ў навучэнцаў была і будзе актуальнай ва ўсе часы існавання сістэмы адукацыі, ва ўсе часы існавання дзяржаўнасці. Менавіта яна дае магчымасць выкарыстання для сябе і краіны гістарычнага вопыту народа, калі можна ўзяць з мінулага ўсё патрэбнае для вырашэння сённяшніх задач; калі можна забяспечыць сувязь пакаленняў і падтрымаць пераемнасць у захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей грамадства.

Выхаванне патрыятызму сродкамі этнаграфіі – гэта важны працэс, які патрабуе актыўнага ўдзелу як дзяржавы, так і грамадства. Праз захаванне і развіццё культурнай спадчыны мы можам стварыць моцную нацыянальную супольнасць, якая ганарыцца сваёй гісторыяй і гатовая працаваць на будучыню роднай краіны.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Цітоў В. С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. Мн. 1997.

2. *Крук Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2003.

3. *Каспяровіч В.* Сімвалы беларускага вяселля // Роднае слова. 2005. №4. С 98–102.

4. *Міцкевіч У.* Побыт сям'і палясоўшчыка. Этнаграфічная абмалёўка лясной каморы // Роднае слова. 1995. №7. С.142–152.

5. *Мяжэвіч В.* «Ой, лянок, лянок мой чысты, валакністы, залацісты». Літаратурна-этнагарафічная гасцёўня // Беларуская мова і літаратура. 2006. №4. С. 50–62.

6. *Садоўская Л.* «Адамаўская святліца запрашае» на літаратурна-музычную вечарыну // Бібліятэка прапануе. 2009. №4. С. 20–21.